# Час і месца вышыванкі




Фактычна ў любой, нават невялікай, краіне існуюць традыцыйныя нацыянальныя строі з выразнымі рэгіянальнымі і лакальнымі адрозненнямі. Кожны народ па-свойму стараўся ўпрыгожыць адзенне, робячы яго непаўторным. Не былі выключэннем у гэтых адносінах і жыхары Беларускай зямлі. Нашы продкі імкнуліся аздобіць свае ўборы асаблівым арнаментам, які служыў не толькі абярэгам, але і добра пазнавальнай нацыянальнай адметнасцю.

У аснове створанага народам на працягу многіх стагоддзяў арнаментальнага дэкору – практычнасць і прастата. З-за вялікай колькасці ручной вышыўкі на даматканых кашулях ва ўжытку стала з'яўляцца назва – вышыванкі. Дарэчы, вышываныя арнаменты звычайна мелі сімвалічнае, нават сакральнае значэнне. І заўсёды надавалі адзенню рысы эксклюзіўнасці. Непаўторная прыгажосць беларускіх вышыванак вабіла прадстаўнікоў розных сацыяльных слаёў грамадства. Не існавала і ўзроставых абмежаванняў.

Фатаграфічныя крыніцы, што захаваліся да нашых дзён, даюць магчымасць меркаваць аб тым, хто і як насіў гэтыя ўнікальныя рэчы – сапраўдныя ўзоры нацыянальнай культуры XX стагоддзя. Мяркуючы па ўсім, упрыгожанае вышыўкай адзенне апраналі не толькі вясковыя жыхары, але і гараджане. З задавальненнем насілі вышыванкі і на дачы, і ў маёнтку. Некаторыя не забывалі схадзіць у прыгожым строі да фатографа і зрабіць здымак «на памяць».

У савецкі час цікавасць да вышыванкі асабліва праявілася ў Беларусі ў перадваенныя і пасляваенныя гады. Аздобленыя вышыўкай рэчы ўдала спалучаліся і з паўсядзённым касцюмам, і з рабочай вопраткай. Павагу да традыцыйных народных строяў, натуральна, дэманстравалі ўдзельнікі самадзейных творчых калектываў.

Прыемна адзначыць, што сёння творчая работа шэрага беларускіх мадэльераў заснавана на выкарыстанні і перапрацоўцы лепшых узораў гістарычнай спадчыны. Сучасная беларуская мода пераймае з мінулага не толькі льняныя тканіны, але і ўнікальныя арнаменты і разнастайныя спосабы дэкаратыўнага аздаблення. Некаторыя майстры моды звяртаюцца і да прамых «гістарычных цытат», імкнучыся захаваць вобраз вышыванкі ў якасці сімвала нацыянальнай культуры.

**Аляксандр САМОВІЧ,**
**доктар гістарычных навук**
**Фота з калекцыі аўтара**









1898



1898




1900




1891




1902



1903



1903




1904



1904


1930
Драм-гурток пры Р.Дз.П.Т.


1955


1957


1944
Слава гэроям наступу!


1959


1933


1958


1954